***Праверце сябе.*** 1. У чым выяўляецца ўнікальнасць рэльефу Гродзенскай вобласці? 2. Якая прадукцыя хімічнай прамысловасці выпускаецца ў Гродзенскай вобласці? 3. Якія помнікі гісторыка-культурнай спадчыны захаваліся на тэрыторыі Гродзенскай вобласці?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Растлумачце асаблівасці нацыянальнага складу насельніцтва Гродзенскай вобласці. 2. Якая спецыялізацыя прамысловасці Гродзенскай вобласці? Якія віды прамысловай прадукцыі вырабляюцца толькі ў Гродзенскай вобласці і чаму?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Распрацуйце турыстычныя маршруты па Гродзенскай вобласці.

## § 48. Мінская вобласць

***Успомніце.*** *У якой частцы вобласці найбольш распаўсюджаны ўзвышшы?*

**1. Роля вобласці ў гаспадарцы краіны.** Удзельная вага валавога рэгіянальнага прадукту Мінскай вобласці ў фарміраванні ВУП краіны складае 19 %. Большы гэты паказчык толькі ў Мінску. Мінская вобласць па ўдзельнай вазе ў агульнарэспубліканскім аб'ёме прамысловай вытворчасці і вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі знаходзіцца на першым месцы (гл. мал. 145).

Па карце атласа (с. 83) вызначце ўдзельную вагу вобласці ў колькасці насельніцтва Беларусі.

**2. Геаграфічнае становішча вобласці.** Мінская вобласць знаходзіцца ў цэнтры Беларусі і выцягнута з поўначы на поўдзень. Гэта адзіная з абласцей краіны, якая не мае знешніх межаў, затое мяжуе з усімі пяццю абласцямі. Па плошчы (40,2 тыс. км$^2$) яна саступае толькі Гомельскай вобласці. Геаграфічнае становішча вобласці выгаднае з эканамічнага пункту гледжання ў сувязі з цэнтральнасцю і размяшчэннем у ёй сталіцы краіны.

**3. Прыродныя рэсурсы.** Мінская вобласць добра забяспечана мінеральнымі рэсурсамі. Распрацоўваецца Старобінскае радовішча калійных і каменнай солей, а таксама радовішчы торфу, будаўнічых пяскоў, пясчана-жвіровага матэрыялу, цагельных глін, сапрапеляў. Адкрыта Аколаўскае радовішча жалезных руд і Любанскае радовішча гаручых сланцаў.

Глебавае покрыва вобласці характарызуецца перавагай дзярнова-падзолістых і дзярнова-падзолістых забалочаных глеб. У структуры зямельнага фонду вобласці сельскагаспадарчыя землі займаюць каля 43 % тэрыторыі (саступае толькі Гродзенскай вобласці). Доля ворных глеб у Мінскай вобласці самая высокая ў краіне — больш за 33 %.

Агракліматычныя рэсурсы Мінскай вобласці спрыяльныя для развіцця сельскай гаспадаркі. Усе агракліматычныя паказчыкі адпавядаюць сярэднім па краіне. Вобласць забяспечана воднымі рэсурсамі. Пераважаюць малыя і сярэднія рэкі, таму што тэрыторыю перасякае Балтыйска-Чарнаморскі водападзел. Для водазабеспячэння Мінска пабудавана Вілейска-Мінская водная сістэма. Прыродныя вадаёмы прымеркаваны да паўночных раёнаў, дзе знаходзіцца Нарачанская група. Розныя функцыі выконваюць буйныя вадасховішчы: Вілейскае, Заслаўскае, Салігорскае і інш.

На карце атласа (с. 6—7) знайдзіце вадасховішчы і вызначце іх функцыянальнае прызначэнне.

Лясістасць Мінскай вобласці нязначна саступае сярэдняй па краіне і складае 38,1 %. У вобласці шмат прыродаахоўных аб'ектаў. На поўначы размешчаны Бярэзінскі біясферны запаведнік, НП «Нарачанскі». У межах вобласці больш за 20 заказнікаў і каля 90 помнікаў прыроды рэспубліканскага значэння, вялікая колькасць заказнікаў і помнікаў прыроды мясцовага значэння.

Курорты і зоны адпачынку рэспубліканскага значэння — Нарач, Мінскае мора, Вілейка — спрыяюць развіццю турызму.

**4. Насельніцтва.** Па колькасці насельніцтва Мінская вобласць займае другое месца — 1460,3 тыс. чалавек. Так як колькасць насельніцтва лічыцца без Мінска, то вобласць характарызуецца самай нізкай доляй гарадскога насельніцтва — 54,7 %. Вялікая доля сельскага насельніцтва абумовіла малую шчыльнасць насельніцтва — 37 чал./км$^2$.

**5. Прамысловасць.** Мае развітую галіновую структуру і цесныя вытворчыя сувязі з прамысловым комплексам Мінска. Доля прамысловасці ў структуры ВРП Мінскай вобласці — 34,1 % (мал. 155). У структуры апрацоўчай прамысловасці вядучую ролю адыгрываюць хімічная і харчовая. Галоўны цэнтр хімічнай прамысловасці — Салігорск (вытворчасць калійных угнаенняў). Выпускаюцца пластмасавыя вырабы, лекі, касметычныя сродкі. Вобласць спецыялізуецца на вытворчасці мяса і мясных вырабаў, малака і малочных прадуктаў, цукру, макаронных вырабаў, мінеральнай вады, безалкагольных напояў.

Назавіце цэнтры вытворчасці хімічнай, харчовай прамысловасці Мінскай вобласці.




Мал. 155. Структура ВРП Мінскай вобласці, 2023 г., %

У вобласці развітое машынабудаванне. Выпрабляецца амаль 100 % самазвалаў (Жодзіна), выпускаюцца электрычныя прыборы.

Якую прадукцыю выпрабляюць прадпрыемствы па вытворчасці будаўнічых матэрыялаў?

Буйное прадпрыемства па вытворчасці будаўнічых металаканструкцый і металічных труб знаходзіцца ў Маладзечне. Развітая сетка прадпрыемстваў па вытворчасці будаўнічых матэрыялаў.

Назавіце цэнтры вытворчасці лёгкай прамысловасці Мінскай вобласці.

Найбуйнейшыя прадпрыемствы па вытворчасці ДВП, запалак, мэблі, вырабаў з паперы знаходзяцца ў Барысаве. У вобласці развітая швейная і тэкстыльная вытворчасць, выпускаецца амаль палова трыкатажных вырабаў, гарбарных тавараў.

У вобласці функцыянуе СЭЗ «Мінск» з рэзідэнтамі ў Барысаве, Маладзечне, Стоўбцах, Фаніпалі, у раёне Нацыянальнага аэрапорта «Мінск».

У Смалявіцкім раёне створаны Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень». Гэта найбуйнейшы праект у гісторыі двухбаковых адносін Беларусі і Кітая, адна з ключавых пляцовак «Эканамічнага пояса Шаўковага шляху» — грандыёзнай ініцыятывы супрацоўніцтва. Якія перспектывы развіцця гэтага супрацоўніцтва?

У структуры прамысловай вытворчасці доля горназдабыўной прамысловасці складае 0,6 %. Самае буйное прадпрыемства галіны размяшчаецца ў Салігорску. Вытворчасць і размеркаванне электраэнергіі ў вобласці мае малое значэнне. Найбуйнейшыя ЦЭЦ размяшчаюцца ў Мінску, а ў гарадах вобласці іх мала. У пасёлку Дружны

Якія геаэкалагічныя праблемы звязаны з распрацоўкай калійных солей?

Пухавіцкага раёна размешчана Мінская ЦЭЦ-5. На рэках паўночнай часткі вобласці пабудаваны малыя ГЭС.

**6. Структура і спецыялізацыя сельскай гаспадаркі.** У структуры ВРП вобласці на долю сельскай, лясной і рыбнай гаспадаркі прыпадае 9,7 %, аднак тут вырабляецца амаль чвэрць сельскагаспадарчай прадукцыі краіны. Спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, птушкагадоўлі, збожжавай гаспадарцы ў спалучэнні з кормавытворчасцю, развітым вырошчваннем буракоў і бульбаводстве. Вакол Мінска і Салігорска сфарміраваліся шырокія зоны прыгараднай спецыялізацыі сельскай гаспадаркі з большай доляй птушкагадоўлі, агародніцтва і садоўніцтва. У структуры пасеваў прыкладна пароўну (па 42 %) займаюць кармавыя і збожжавыя культуры.

Вобласць лідзіруе па пасевах цукровых буракоў, бульбы і гародніны, вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі. Лідар Мінская вобласць і па валавой вытворчасці мяса і малака.

**7. Геаграфія сферы паслуг.** Доля сферы паслуг у структуры ВРП вобласці — 42,3 %. Доля транспарту і сувязі складае толькі 4,2 % ВРП. Тэрыторыю Мінскай вобласці перасякаюць транс'еўрапейскі транспартны калідор II і адгалінаванне калідора IX. Працягласць чыгунак невялікая (871 км), а вось па працягласці аўтамабільных дарог вобласць займае першае месца ў краіне (больш за 23 тыс. км). Лідзіруе яна і па аб'ёмах грузаў, якія перавозяцца аўтатранспартам. Сфарміравалася густая сетка газаправодаў рэспубліканскага значэння. Праходзіць магістральны газаправод «Ямал — Еўропа».

У Мінскай вобласці функцыянуюць два філіялы ўстаноў вышэйшай адукацыі і 25 каледжаў і ліцэяў. Практычна ў кожным раёне вобласці працуюць музеі, у Маладзечне — Мінскі абласны драматычны тэатр і Тэатр юнага гледача, традыцыйна праводзіцца фестываль беларускай песні.

У Мінскай вобласці размешчаны Нясвіжскі замак — цэнтр турызму і адпачынку міжнароднага значэння, помнік Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Прыцягваюць турыстаў і спартыўныя аб'екты: гарналыжныя цэнтры «Сілічы» і «Лагойск», цэнтр зімовых відаў спорту ў Раўбічах, вяслярны канал у Заслаўі (мал. 156), футбольны стадыён «Барысаў-Арэна».



Мал. 156. Вяслярны канал у Заслаўі

Прааналізуйце карты атласа (с. 61–71) і знайдзіце аб'екты сферы паслуг вобласці.

**8. Найбуйнейшыя эканамічныя цэнтры вобласці.** Самым буйным па колькасці насельніцтва горадам Мінскай вобласці з'яўляецца **Барысаў** (135,7 тыс. жыхароў). Вядомы ў першую чаргу як прамысловы цэнтр. Размяшчаецца на ўсходзе вобласці на рацэ Бярэзіна. У Барысаве выпускаюцца генератары, лекавыя прэпараты, вырабы з пластмасы, дрэва, паперы, мэбля, макаронныя вырабы.

Другі па колькасці насельніцтва горад — **Салігорск** (97,8 тыс. жыхароў). Размешчаны на поўдні вобласці, адзін з самых маладых у краіне. Узнік дзякуючы распрацоўцы калійных солей і вядомы як горад шахцёраў. Салігорск — адзін з найбуйнейшых цэнтраў хімічнай прамысловасці. Акрамя калійных угнаенняў выпрацоўваецца кухонная соль. Ёсць прадпрыемствы па вытворчасці жалезабетонных канструкцый, трыкатажу і адзення, харчовай прамысловасці.

Трэці па колькасці насельніцтва горад — **Маладзечна** (89 тыс. жыхароў). Знаходзіцца на паўночным захадзе вобласці. Характарызуецца шматгаліновай прамысловасцю. Тут вырабляюцца трубы, прычэпы, электроннае абсталяванне, пластмасы, драўляная тара, мэбля, жалезабетонныя вырабы, верхняе адзенне, харчовыя прадукты.

**9. Знешнеэканамічныя сувязі.** На долю Мінскай вобласці прыпадае 19 % знешнегандлёвага абароту рэспублікі. У таварнай структуры экспарту пераважаюць калійныя і мінеральныя змешаныя ўгнаенні, грузавыя і легкавыя аўтамабілі, вагоны чыгуначныя і трамвайныя, лесаматэрыялы, мясная і малочная прадукцыя, часткі і прылады для аўтамабіляў і трактароў, лекавыя сродкі.

**Падвядзём вынікі.** Мінская вобласць займае цэнтральнае становішча. Па колькасці насельніцтва займае другое месца. Вядучая па вытворчасці калійных угнаенняў, самазвалаў, легкавых аўтамабіляў, макаронных вырабаў, цукру, гарбарных тавараў, трыкатажных вырабаў.

***Праверце сябе.*** 1. Якія асаблівасці геаграфічнага становішча Мінскай вобласці? 2. Назавіце галіны спецыялізацыі прамысловасці Мінскай вобласці. 3. Па якіх відах сельскагаспадарчай прадукцыі Мінская вобласць лідзіруе?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Як уплывае на развіццё гаспадаркі вобласці Мінск? 2. Чым тлумачыцца высокая ступень развіцця турысцкіх паслуг у вобласці?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Складзіце спіс аб'ектаў, якія вы хацелі б наведаць у такіх гарадах вобласці, як Жодзіна, Слуцк, Вілейка.

## § 49. Горад Мінск

***Успомніце.*** *Якія функцыі выконвае звычайна сталічны горад?*

**1. Роля горада ў гаспадарцы краіны.** Удзельная вага валавога рэгіянальнага прадукту Мінска ў фарміраванні ВУП краіны складае 30,3 %. Гэта найбуйнейшы цэнтр прамысловасці і сферы паслуг. Па велічыні ВРП пераўзыходзіць усе вобласці краіны. У структуры ВРП пераважае сфера паслуг (мал. 157).




Мал. 157. ВРП г. Мінска, 2023 г., %

Горад Мінск па ўдзельнай вазе ў агульнарэспубліканскім аб'ёме прамысловай вытворчасці знаходзіцца на трэцім месцы (мал. 145, *а*).

Па карце атласа (с. 83) вызначце ўдзельную вагу Мінска ў колькасці насельніцтва Беларусі.

**2. Геаграфічнае становішча.** Мінск з'яўляецца галоўным палітычным, прамысловым, навуковым і культурным цэнтрам краіны, найбуйнейшым транспартным і тэлекамунікацыйным вузлом.

У Мінску знаходзяцца Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Урад краіны, дыпламатычныя прадстаўніцтвы, каардынуючыя органы СНД.

Упершыню горад згадваецца ў летапісе ў 1067 г. Размяшчаецца недалёка ад геаграфічнага цэнтра Беларусі ў межах Мінскага ўзвышша на рацэ Свіслач. Займае тэрыторыю плошчай 354 км$^2$. Горад падзяляецца